Упраўленне па адукацыі

адміністрацыі Маскоўскага раёна г.Мінска

Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа № 215 г. Мінска”

III Рэспубліканскі конкурс

распрацовак літаратурнага

матэрыялу для дзіцячага тэатра

**Праблематыка:** маральна-філасофская

**Сцэнар тэатральнага прадстаўлення**

**“Вандраванне Бядулі”**

**Узрост:** для падлеткавага ўзросту

**Аўтар:**
Бельская Наталля Валер’еўна,
настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №215 г.Мінска”,
вул. Слабадская, 41,
кантактны тэлефон: +375291544837,
адрас электроннай пошты: natabelskaa62@gmail.com

Мінск, 2023

**Бельская Наталля Валер’еўна**

## Візітка аўтара

Бельская Наталля Валер’еўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА «Сярэдняя школа № 215 г. Мінска». Раскажу крыху пра сябе.

Усё маё жыццё нагадвае лесвіцу, па якой я ўпэўнена рухаюся ўверх для дасягнення сваіх мэт. Мае мэты – гэта мае мары. Часам нечаканыя і дзёрзкія, а часам чароўныя і незвычайныя. Менавіта мары дапамаглі мне скончыць філалагічны факультэт БДУ і стаць паспяховым настаўнікам роднай мовы і літаратуры. Я настаўнік першай катэгорыі. За свае 9 гадоў педагагічнай дзейнасці заваявала шмат вяршыняў у прафесійнай сферы, апошняя з іх дыплом II ступені раённага этапу ў конкурсе “Сталічны настаўнік-сталічнай адукацыі”.

З’яўляючыся рознабаковай і творчай асобай, я часам пішу вершы, а ў вольны час глыбока вывучаю псіхалогію і філасофію, якія напаўняюць мяне новымі думкамі і ідэямі. Мару атрымаць другую вышэйшую адукацыю ў сферы псіхалогіі, дзе я змагу не толькі раскрыцца як індывідуальнасць, але і атрымаць каштоўныя веды, з якімі ў будучыні мару пакарыць не адну вяршыню.

**Намінацыя:** Драматургічны матэрыял для дзіцячага тэатра паводле літаратурных твораў

**Праблематыка:** маральна-філасофская

**Аўтар:**

Бельская Наталля Валер’еўна,

настаўнік дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 215 г.Мінска”,

вул. Слабадская, 41,

кантактны тэлефон: +375291544837,

адрас электроннай пошты: natabelskaa62@gmail.com

**Узрост:** для падлеткавага ўзросту.

Дадзеная распрацоўка тэатральнага прадстаўлення можа быць выкарыстана ў рамках дадатковай адукацыі як гуртковай дзейнасці, так і дадатковай адукацыйнай паслугі. Яе выкарыстанне дапаможа педагогам арганізаваць адукацыйную і развіваючую прастору, дыягнастычнае даследванне развіцця творчых здольнасцей вучняў старэйшай школы.

Асноўная частка метадычнай распрацоўкі ўключае сцэнарый тэатральнага прадстаўлення “Вандраванне Бядулі”.

Актуальнасць дадзенай працы заключаецца ў тым, што тэатральная пастаноўка - адзін з самых дэмакратычных і даступных для вучняў відаў мастацтва, яна дазваляе вырашаць шматлікія актуальныя праблемы педагогікі і псіхалогіі, злучаныя з мастацкім і маральным выхаваннем, развіццём камунікатыўных якасцей, развіццём памяці, уяўлення, фантазіі, спрыяе развіццю таленту.

У вучняў фарміруюцца ўяўленні аб тэатры, развіваецца эстэтычны густ і разуменне пачуцця прыгожага.

**Анатацыя**

Што такое шчасце, простае, чалавечае? Напэўна, кожны з нас задаваўся гэтым пытаннем хаця б аднойчы ў жыцці. Хтосьці лічыць шчасцем мець вялікую сям’ю, якая была б падтрымкай і апорай у любых складаных жыццёвых абставінах, хтосьці адчувае сябе шчаслівым, калі знаходзіць любімую справу ў жыцці, а хтосьці прымае за шчасце нейкія матэрыяльныя каштоўнасці. Спіс можна працягваць бясконца, бо колькі жыве людзей, столькі існуе думак наконт таго, што для чалавека з’яўляецца шчасцем. Я глыбока ўпэўнена, што на гэтае філасофскае пытанне няма (і ніколі не было) правільнага адказу, бо кожны чалавек мерае гэтае паняцце па сваіх мерках, апіраючыся на свой асабісты жыццёвы вопыт і маральныя каштоўнасці.

У сваім сцэнарыі тэатральнага прадстаўлення “Вандраванне Бядулі” я паспрабавала адшукаць адказ на складанае філасофскае пытанне пра шчасце. Аб’яднаўшы ў адзін сюжэт некаторыя творы знакамітага беларускага пісьменніка і паэта Змітрака Бядулі, у мяне атрымаўся новы погляд на тэму шчасця. А што з гэтага атрымалася, вырашаць вам.

**Сцэнар тэатральнага прадстаўлення**
**“Вандраванне Бядулі”**

**(па матывах твораў Змітрака Бядулі)**

Дэкарацыі: возера, лес, зала суда, кірмаш.

Нацыянальныя беларускія касцюмы, касцюм суддзі.

Музыкальнае суправаджэнне пад фальклорныя песні.

**Дзейныя асобы:**

*Дзядок Бядуля – фальклорны дзядок, які вандруе па свеце ў пошуках шчасця.*

*Ганулька – нявеста парабка Ягоркі.*

*Пан Крыніцкі – напышлівы пан.*

*Тэкля – маці Лаўрука.*

*Лаўрук – адвакат.*

*Ягорка – парабак пана Крыніцкага.*

*Гандляр*

*Суддзя*

*Музыка*

**Самуіл Яфімавіч Плаўнік больш вядомы пад псеўданімам Змітрок Бядуля. Такі псеўданім мае фальклорнае паходжанне. У беларускіх казках ёсць вобраз добрага дзядка Бядулі, які ходзіць па свеце і ўсіх суцяшае.**

*Блукае дзядок Бядуля і вядзе маналог.*

- Столькі вандрую па свеце… у стольківх месцах пабываў… столькі людзей пабачыў… гора людское бачыў, радасць людскую бачыў… А ўсё ж добры наш народ! Бо душа ў яго заўсёды добрай была і багатай… хоць і кішэні наскрозь дзіравыя (дзядок выварочвае свае кішэні і пасмейваецца). Але ад адных толькі поўных кішэняў не будзе шчасця чалавеку!.. Ці будзе?! А ўвогуле, што такое шчасце?!.. Напэўна, шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце…

*Яго думкі перапыняе голас дзяўчынкі, якая спявае і мые бялізну ў рацэ.*

*Набяру я збан вадзіцы,*
*Буду мыцца, весяліцца…*
*Як рассеюцца туманы,*

*У люстэрка-рэчку гляну*
*На свой белы твар дзявочы…*
*Назбяру шмат кветак белых,*
*Назбяру шмат ягад спелых…*
*І пайду цяністым борам…*
*Там схаваюся далёка*
*Ад зайздроснага ад вока…*
*Там у пушчах у хваёвых*
*Прыпаду да мшыстай горкі,*
*Там сустрэнуся з Ягоркам.*

*Дзядуля прысаджваецца побач і радасна пазірае на яе. Раптам да дзяўчынкі падыходзіць пан і кажа:*

- Я маю зямлі сем валок, стады мае багатыя, коні мае дарагія, парабкі мае адзін у адзін, як тыя дубы на ўзгорку. Гэта такое шчасце! Пайдзі за мяне замуж, дзяўчынка! Будзеш і ты тады самай шчаслівай!
- Ой, не пайду замуж за цябе: не трэба мне золата, серабра, не трэба багатага молайца. Я кахала аднаго – кахаць буду; цалавала аднаго і - цалаваць буду. Ён у цябе парабкам служыць, па мне заўсёды тужыць. Шчасце не ў золаце, пане!
- Ну паглядзім! Ты яшчэ пашкадуеш! – *пан знікае.*

*Да дзядка Бядулі нечакана падыходзіць старая жанчына.*

- Ой! Дзядочак! Ой, родненькі! Можна я побач з табою пасяджу. Так доўга я ішла! Так стамілася! – *пачала прычытаць Тэкля.*
- Прысаджвайся, старая! У нагах праўды няма!

*Тэкля садзіцца побач.*

- Хто ты, дарагая жанчына? Адкуль шлях свой вядзеш? – *спытаўся Бядуля.*
- Тэкля я! Здалёк за шчасцем сваім ішла. Усе ногі пазбівала, а шчасця так і не знайшла.
- Шчасця шукала?! Гэта добра! А што такое шчасце, Тэкля? – *спытаў Бядуля.*
- Што такое шчасце?! Якое смешнае пытанне! Канешне жа мой сыночак, мой галубочак, крывінушка мая, Лаўручок мой! Ведаеш які ён?! – *загаманіла Тэкля.*
- Не, а які? – *адказаў Бядуля.*

*… Ідзе суд (за кадрам голас Тэклі).*

[Сыночак мой! Лаўручок родненькі! Ён у горадзе аблакатам працуе. Такі сумленны! Ніколі нікога не падмане!..]

*Перад суддзёй стаіць пан са сваім адвакатам (Лаўруком) і яго парабак. Пан крычыць на ўвесь суд:*

- Во ён які! Хлус і злодзей! Ён абрабаваў мяне! *(Указвае на свайго парабка)* Мяне! Паважанага чалавека, які ўсё жыццё толькі і робіць, што працуе і працуе!
- Паважаны суд! Клічуць мяне Лаўрэнцій Кіпрыянавіч. Я адвакат пана Крыніцкага. На днях мой падапечны, пан Крыніцкі, падлічваў свой ураджай. Пры падліку пан Крыніцкі не далічыўся мяшка збожжа і мяшка бульбы. Пад падазрэнне папалі парабкі, якія служаць у пана. Пры вобыску хат, дзе жывуць сем'і парабкаў, нічога цікавага пан не знайшоў, але ў апошняй хаце, спадара Ягора, мой падапечны заўважыў некаторую нярвовасць свайго парабка і вырашыў затрымацца яшчэ, каб лепей пашукаць. У выніку мой падапечны знайшоў… Як Вы лічыце што?! Правільна! Свой мяшок збожжа і мяшок бульбы, які яму належыць. *– распавядаў Лаўрук.*
- Гэта няпраўда! – *спрабуе бараніцца парабак.*
- Як гэта няпраўда! Як гэта няпраўда! Хто цябе слухаць будзе, рвань! – *не супакойваецца пан.*
- Цішыня ў зале суда! Суд ва ўсім разбярэцца! Працягвайце, Лаўрэнцій Кіпрыянавіч. – *спыніў суддзя.*

[Такі сыночак добранькі ўдаўся! Крывінушка мая родная! Сонечны праменьчык мой! А які ён справядлівы, дзядулька! Каб ты толькі ведаў! Такі справядлівы!..]

- Дзякуй! Высокі суд! Паколькі спадар Ягор вінаваты ў кражы збожжа і бульбы, т. як згубленыя мяшкі знайшлі менавіта ў яго хаце, а ў нас яшчэ і сведкі ёсць, я прашу Вас пакараць злачынцу па ўсёй строгасці закона. Такому злачынцу не месца сярод нас, добрасумленных і працавітых людзей! Лічу, што такога злачынцу трэба пасадзіць у астрог і ўсю яго маёмасць, а гэта невялікі надзел зямлі, на якім размешчаны бацькоўскі дом, перадаць у асабістасць пана Крыніцкага.
- Гэта несправядліва! Мае бацькі зусім старэнькія і хворыя! Дзе ж яны будуць жыць? Я адзіны хто іх корміць! – *выкрыквае парабак.*
- А пра гэта, спадар Ягор, думаць трэба было раней, калі вы бессаромна абкрадвалі пана. А зараз прашу мяне не перабіваць! – *сказаў Лаўрук.*
- А я і не перабіваю! Проста я прыйшоў у суд за праўдай, а вакол жудасная несправядлівасць! – *адказаў парабак.*
- Паясніце суду, спадар Ягор, у чым жа несправядлівасць?! Вас злавілі на кражы. Чаму вы зараз не хаціце адказваць за свае ўчынкі?! – *спытаў суддзя.*

*Парабак пачаў сваю гаворку:*

- Да таму што не краў я нічога! Крыніцкі на днях заваліўся да мяне, лаяцца пачаў, каб я ад нявесты сваёй адказаўся, а я выставіў яго са свайго двара. Вось ён і адпомсціць мне вырашыў. Людзей нейкіх знайшоў, якія быццам бы бачылі, як я мяшкі з ураджаем ягоным выносіў, а пасля іх у хляве маім знайшлі. Я адразу ў горад да адваката нашага лепшага пабег. Да яго пабег *(указвае на Лаўрука)!..*

[Ой, Лаўручок мой, ой, шчасцейка маё! Заўсёды, дзядулечка, усім дапамагае! Нікому не адказвае, бо сэрца ў яго вялікае і добрае!..]

- … Паверыў, што паважаны адвакат выратуе ад ненавіснага пана, а ён такія грошы мне сказаў заплаціць! Колькі на свеце жыву, а грошай такіх ніколі ў руках не трымаў! Як я толькі не прасіў яго аб дапамозе! Думаў, што сэрца ягонае вялікае і добрае, але дарэмна! Не стаў Лаўрэнцій Кіпрыянавіч без грошай мне дапамагаць, а пану стаў, бо хто нашаму паважанаму адвакату больш плаціць, з тым ён і справы мае і ніколі не будзе ён простых людзей у судзе абараняць. Так ўсе пра яго ў горадзе адклікаюцца, *– скончыў сваё паведамленне Ягорка.*
- Але, паважаны суд! Каму Вы будзеце верыць? Мне, паважанаму адвакату, ці нейкаму злодзею-абадранцу?! – *умяшаўся Лаўрук.*

*… Тэкля сядзіць побач з дзядком. Па шчацэ ў яе цячэ сляза. Яна пытаецца ў Бядулі:*

- Дзядок, а дзядок?! Ты верыш мне?!
- Канешне, Тэкля, веру! Добры ў цябе сын. І ты добрая. – *суцяшае яе Бядуля.*
- Маё ж матчына сэрца ўсё адчувае, усё ведае… адзінае маё шчасце –побач з ім быць, – *адказала Тэкля.*
- Што ж… у кожнага свая праўда і свой шлях да шчасця… Не сумуй, Тэкля! Ідзі з Богам і будзь здаровая! – *сказаў Бядуля.*

*Тэкля і Бядуля разам устаюць і накіроўваюцца ў розныя бакі.*

*Наступнае дзеянне адбываецца на кірмашы.*

*На кірмашы шумна і весела. Іграюць фальклорныя творы,якія звычайна выконваліся на кірмашах. Бядуля прагульваецца каля розных гандляроў. Раптам ён чуе голас:*

- Купіце, дзядуля, што-небудзь з посуду. Паглядзіце, які ён прыгожы. А лыжкі! Толькі паглядзіце на гэтыя лыжкі! Адна лепей за другую! Апошнія засталіся! Купляйце, дзядуля! Не пашкадуеце!

*Бядуля спыніўся каля гандляра драўляным посудам і пачаў разглядваць лыжкі, а пасля кажа:*

- І сапраўды выдатныя лыжкі! Адразу бачна, што выдатны майстар рабіў, што справу сваю любіць! Шчаслівы, напэўна, чалавек, што справу сваю любіць!

- Майстар та можа і выдатны, але нешчаслівы! Затое посуд прыгожы зрабіў. Адзінае, што пасля яго і засталося, так хоць людзям прадам! Хай людзям простым паслужыць гэты посуд, а то стаяў столькі часу, быццам бы ў музеі, *– адказаў гандляр.*

- А чаму, добры чалавек, ты кажаш, што майстар твой нешчаслівы? *– спытаў дзядуля.*

- Гэта не я кажу, а людзі так кажуць! Жыў у маёй вёсцы бондар. Таленавіты чалавек, якіх свет не бачыў, і кожны дзень ён нейкія рэчы цудоўныя вырабляў: то бочкі драўляныя, то посуд. А як добра ў яго атрымоўвалася гэтая справа! Роўных яму на ўсю ваколіцу не было, але каб ён нос свой не задзіраў! Хоць бы навучыў каго бочкі тыя з посудам рабіць, дык успаміналі б зараз словам добрым, а ён шчасця свайго пайшоў на панскі двор шукаць. І як ты лічыш, дзед, знайшоў?! *– спытаў гандляр.*

- Няўжо знайшоў?! *– здзіўлена запытаў Бядуля.*

- Канешне не! Яна нават не паглядзела на ягоны посуд. Проста грошы дала і ўсё. А ён жа думаў што?! *– спытаў гандляр.*

- Што?! *– пераспытаў Бядуля.*

- Што шчасце сваё знойдзе, што ацэняць яго, пахваляць. Мы ж, яго суседзі, нічога не разумеем! Мы ж,беднота неадукаваная, як мы можам ацаніць?!.. А я, такі ж бядняк, як і мае суседзі, першы ацаніў яго залатыя рукі! Дарэчы і ты, дзядуля, бачу не вельмі багаты, а адразу заўважыў, што майстар посуду – таленавіты чалавек. Хацеў, каб ён і мяне справе бондарскай абвучыў, няўжо яму цяжка было?! Колькі разоў заходзіў да яго, але дарэмна. Суседзі заходзілі і іх выганяў. Шчасця шукаў на панскім двары, а менавіта там яго і згубіў, а пасля і сябе згубіў! Так і не стала таленавітага бондара. Вырабы яго раскупілі ўжо і застаўся толькі гэты посуд, - *скончыў гандляр.*

*Бядуля ўважліва слухаў аповед пра бондара і круціў галавою:*

- Як шкада! Як шкада! Не зразумеў бондар, што для яго шчасцем было! Не зразумеў! - *прыгаворваў дзед.*

*Увага гандляра адцягнулася новым пакупнікам. У гэты час Бядуля рушыў далей. Нечакана ўвагу дзеда прыцягнула чароўная музыка. Бядуля пачаў азірацца, шукаючы музыку…*

*А музыка іграў і іграў. Так шчыра іграў ад усёй душы, ажно сам цешыўся, і ўсё вакол яго цешылася… Гэта была песня без слоў, бо хлопчык іграў для сонейка, а сонейка без слоў добра разумела… Дзівіліся дрэвы, птушкі,рэчка, неба. Дзіву далася ўся зямля…. І вось на ўсходзе сонейка на лузе пачалася вялікая музыка: усе стварэнні на зямлі і сама зямля ігралі і спявалі, кожны на*

*свой лад, на тысячы-тысячы галасоў. Увесь свет выглядаў велізарнай скрыпкай з незлічона многімі струнамі. Гэта было так хораша, так цудоўна прыгожа, ажно само сонейка вельмі ўзрадавалася…і пацалавала маленькага хлопчыка…*

- Дык вось яно, тое шчасце, якое ўсё вакол азарае! – *не вытрымаў Бядуля.*

*Нечакана музыка сціхла.*

*Прачнуўся дзед на тым самым месцы, дзе ўбачыў дзяўчынку з панам, але ўжо вакол нікога не было.*

- Во дзіва! Пайшоў шчасце шукаць і прыснуў! (*Пасмейваецца*) А ўсё ж добры наш народ! І душа ў яго добрая, а галоўнае, што яна багатая; а паны гэтыя толькі і багатыя на золата, а ў душы пустэча і холад. А хіба можа пусты і халодны чалавек шчасцем свяціцца, як той музыка?! (*Кутаецца ў адзенне*) А які ж сёння моцны вецер! Калісьці яшчэ мая бабуля гаварыла, што ў лясах і балотах чэрці вяселле спраўляюць – ад іх і вецер. Калі б трапіць на полі ў самую крутню ветру, што ўзнімае лісце і пыл і круціць на адным месцы, нібы ў паветраным віры, ды кінуць туды нож, гартаваны тры разы і апушчаны ў ваду тры разы, - нож трапіць у чорта. На нажы будзе кроў. Калі гэтай крывёй вымажаш лоб, станеш невідзімкай. Ох, як жа хочацца такім стаць, каб прайсці неведзімкай праз усё гора людское і больш пра яго не чуць, а чуць толькі чароўнага музыку, які, хоць і на хвіліну, але азарыў наваколле шчасцем… А ўсё ж шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце, але кожны чалавек мае сваю асобную мерку да шчасця і свой асобны погляд на самое шчасце…

*Бядуля ідзе ўглыб лесу. Гучыць фальклорная песня.*

**Спіс літаратуры:**


1. Абразкі, мініяцюры, апавяданні, аповесць. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. — 326 с. — (Школьная бібліятэка). (“Шчасце не ў золаце”)
2. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т.У. Логінава, Г. А. Сухава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 240 с. : іл. (“На Каляды к сыну”)
3. Зм. Бядуля. Верш “Ганулька”.
4. Зм. Бядуля. Апавяданне “Бондар”.
5. Зм. Бядуля. Апавяданне “Музыка”.
6. Зм. Бядуля. Апавяданне “У дрымучых лясах”.